*атр драмы і камедыі імя У.Галубка*, узорныя — т-р лялек «Усмешка» Цэнтра дзіцячай творчасці (кіраўнікі: з 1976 В.Вішняк, з 1996 Н.Волахава; у рэпертуары — «Чабурашка» Л.Успенскага, «Казка пра рыбака і залатую рыбку» А.Пушкіна, «Дзякуй, вялікі дзякуй!» А.Вярцінскага, «Каза-манюка» па матывах нар. казкі і інш.) і тэатр. калектыў «Мельпамена» пры Цэнтры дзіцячай творчасці (кіраўнікі І.Паўлючэнка, С.Волахава-Васілевіч; у рэпертуары — «Падзеі ў вёсцы Бpахуны» па матывах бел. фальклору, «Кошчын дом» С.Маршака, «Нічагушык» М.Булаева і інш.). З 1950 працуе дзіцячая муз. школа, пры ёй дзейнічаюць нар. калектывы: духавы аркестр (з 1957; кіраўнікі: засл. работнік культ. Беларусі І.Музычка, Ю.Краўчанка, А.Чарняўскі, П.Лазука; народны з 1975), аркестр нар. інструментаў (з 1960; кіраўнікі: А.Мякіннікаў, В.Спільнічэнка, Г.Лазоўская, У.Саламонік, Л.Грудзініна; народны з 1982), ансамбль «Класіка» (з 1996, кіраўнік В.Андрушчанкава; народны з 2000). Сярод узорных калектываў: эстрадны ансамбль «Вясёлка» (з 1979, кіраўнік В.Трафімовіч, канцэртмайстар Л.Швядко; народны з 1999), хор «Пралескі» (з 1990; кіраўнік В.Улазоўская; народны з 1998), ансамбль скрыпачоў (з 1959; кіраўнікі Р.Скубская, Р.Сарапулава, Л.Растаргуева, І.Кулакова; народны з 2001). Пры палацы моладзі дзейнічае ансамбль нар. песні і музыкі «Случчанскія святкі» (з 1996; кіраўнік С.Пратасевіч; народны з 2000). Працуюць хары «Гасцінец» пры вучэбна-вытв. прадпрыемстве Бел. т-ва інвалідаў па зроку (з 1955; кіраўнік І.Жук; народны з 1967), «Пачастунак» Слуцкага мясакамбіната (з 1976; кіраўнікі: М.Семяновіч, Ю.Краўчанка, А.Шыян, В.Задарожны, М.Барцэвіч; народны з 1992).

*В.С.Відлога.*

**СЛУ́ЦКАЯ БАЛЕ́ТНАЯ ШКО́ЛА.** Дзейнічала ў 1756—60 пры *Слуцкім тэатры Радзівіла*. Балетмайстры — італьян. харэограф і танцор А.Пуціні і франц. Л.М.*Дзюпрэ*, капельмайстар — Ф.Вітман (пісаў музыку да опер і балетных пастановак). Школа размяшчалася ў флігелі, у ім жылі балетмайстар і 8—10-гадовыя дзеці мясц. прыгонных сялян, мела сваю касцюмерную («вярсцярню») і неабходныя матэрыялы. Яшчэ адна сцэна Радзівілаў знаходзілася ў Белай (цяпер Бяла-Падляска, Польшча). Першы танец, якому вучылі дзяцей, — кантрданс (неабходны для пастараляў). Да 1759 пастаўлены «Балет на тры пары», «Балет з Арлекінам», «Венгерскі балет», «Турэцкі балет», шэраг пастараляў і дывертысментаў з ням., швейц. і цірольскімі танцамі, танцы «стралкоў», «чараўнікоў», «садоўнікаў», «чарцей», «камінараў», «кветачніц» і «сялянак». У 1756 адбыліся першыя гастролі ў Нясвіжы, у 1757 — наступныя, апошнія — у снежні 1759. З 1760 (пасля смерці Г.Ф.Радзівіла) слуцкі балет зліўся з нясвіжскай трупай М.К.Радзівіла, якая па колькасным складзе наблізілася да найбуйнейшых балетных труп у Зах. Еўропе. У Слуцку падрыхтаваны першы бел. балетмайстар А.Лойка (пазней працаваў у Нясвіжы).

*Літ.*: Гл. да арт. *Слуцкі тэатр Радзівіла.*

*І.А.Алексніна.*

**СЛУ́ЦКІ КАЛГА́СНА-САЎГА́СНЫ ТЭА́ТР.** Існаваў у 1936 — чэрв. 1941 у г. Слуцк. Створаны з аматараў, у 1938 папоўнены выпускнікамі вучылішчаў Маскоўскага камернага т-ра, т-ра імя Я.Вахтангава і студыі імя М.Ярмолавай. Маст. кіраўнік С.Тураў. Рэжысёры Ю.Рашымаў, Т.Андрэеў-Бурлак, А.Арджанаў, Н.Пахомаў, Гайманаў. У рэпертуары: «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «Позняе каханне», «Без віны вінаватыя» і «Жаніцьба Бальзамінава» А.Астроўскага, «Васа Жалязнова» (рэж. Рашымаў; прызавое месца на рэсп. фестывалі тэатраў) і «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага, «Платон Крэчат» А.Карнейчука (рэж. Тураў), «Разлом» Б.Лаўранёва, «Любоў Яравая» К.Транёва, «Машачка» А.Афінагенава, «Слава» В.Гусева, «Забаўны выпадак» К.Гальдоні. Сярод акцёраў: П.Алашаеўскі, Арджанаў, В.Арлова, А.Васільеў, Е.Васілеўская, А.Варабей, А.Гарэлаў, В.Каваль, І.Каменская, М.Касач, Пахомаў. Усяго паказана 1200 спектакляў і канцэртаў, тэатр пабываў амаль ва ўсіх населеных пунктах Мінскай вобл., паралельна з творчай работай займаўся культ.-асв. дзейнасцю, дапамагаў пашырэнню і развіццю аматарскага мастацтва, аказаў уплыў на маст.-культ. жыццё даваен. Слуцка.

*І.А.Алексніна.*

**СЛУ́ЦКІ НАРО́ДНЫ ТЭА́ТР ДРА́МЫ І КАМЕ́ДЫІ ІМЯ́ У.ГАЛУБКА́** гарадскога Дома культуры. Створаны ў 1950, з 1961 мае званне народнага (спектакль «Папараць-кветка» І.Козела, рэж. К.Лужанская). Кіраўнікі: М.Бортнік (з 1950), Лужанская (з 1961), М.Мацкевіч (з 1970), А.Салавей (з 1983), С.Ануфрэйчык (з 2000). Калектыў — лаўрэат Рэсп. фестывалю самадз. нар. тэатраў (1993, г. Мазыр, спектакль «Пісаравы імяніны» Галубка, рэж. У.Залатухін, Салавей), Міжнар. фестывалю тэатр. мастацтва «Рампа дружбы-94» (г. Еўпаторыя, Гран-пры, спектакль «Паўлінка» Я.Купалы, рэж. Салавей), дыпламант

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ